**Я.А. Рэянтовіч**

# ГУМАНІСТЫЧНАЯ РАЗМЕРНАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ФАНТАСТЫКІ

## ГУМАНИСТИЧЕСКАЯ РАЗМЕРНОСТЬ БЕЛОРУССКОЙ ФИЛОСОФСКОЙ ФАНТАСТИКИ
## THE HUMANIST DIMENSION OF THE BELARUSIAN PHILOSOPHICAL FICTION

Одним из ориентиров современной социально-философской фантастической литературы является гуманистическая направленность. Выступая отражением настоящего и предостережением будущего, фантастический жанр утверждает гуманизм как необходимое условие гармоничного социального развития.

Ключевые слова: гуманизм, гуманность, фантастика, вариантность существования, ответственность.

The basis of modern philosophical fiction is humanistic orientation. Acting as a reflection of the present and a warning of the future, the fantastic asserts humanism as a necessary condition for harmonious social existence and development.

Keywords: humanism, humanity, fiction, variant of existence, responsibility.

Науч. рук. – Е.Н. Лагунова, преподаватель БГУИР, Минск, Беларусь.

Чалавек не нараджаецца добрым або злым, выхаваным або разбэшчаным. Характар кожнай асобы фарміруецца толькі падчас узаемадзеяння з грамадствам. У самім грамадстве, падзеленым на розныя сацыяльныя класы і групы, існуюць «правілы», якія вызначаюць, што з’яўляецца дазваляльным, а што – недапушчальным. Такімі «правіламі» з’яўляюцца законы і іншыя нарматыўныя дакументы, якія дакладна рэгулююць адносіны грамадзяніна і дзяржавы. Аднак існуе цэлая сістэма адносін, паводзін і светапогляду, якую вельмі цяжка апісаць заканадаўча. Гэтая сістэма склалася ў працэсе гістарычнага развіцця чалавецтва. У яе аснове ляжаць базавыя паняцці – дабро і зло. Такая сістэма мае назву гуманізм.

Паняцце гуманізму шматзначнае. Гэта і светапогляд, асновай якога з’яўляецца зямны чалавек з уласцівымі яго прыродзе справамі, імкненнямі, жаданнямі, здольнасцямі. Гэта і асаблівая практыка жыцця, заснаваная на прынцыпах роўнасці, справядлівасці.

Адсюль і цесная сувязь гуманізма з паняццем гуманнасці. «Гуманнасць», як чалавечнасць, чалавекалюбнае і спагадлівае стаўленне да людзей. Кампанентамі гуманнасці выступаюць павага, чуласць, пачуццё справядлівасці, спачуванне, давер, самакрытычнасць, мужнасць – усё тое, што забяспечвае існаванне і развіцце чалавека и грамадства.

Разумнае існаванне асобы вызначае гуманнае стаўленне чалавека да людзей. Чалавекалюбства – неабходная ўмова гармоніі свету. Светапогляд асобы пачынае фарміравацца з самага нараджэння, і мы з дзяцінства на прыкладах класічных твораў, на ўласным небагатым вопыце вучымся бачыць стан таварыша, праяўляць увагу і цікавасць да ўнутранага свету іншага, дружалюбнасць, спагаду, вучымся адкрыта, але інтэлігентна выказваць свае пачуцці. А больш вызначальным, пераломным у фарміраванні асобы з’яўляецца падлеткавы ўзрост.

Падлеткі актыўна далучаюцца да сусветнай культуры, да досведу цэлай цывілізацыі, да літаратурных твораў класікаў і сучасных пісьменнікаў, да прадуктаў шоу-індустрыі і кінавытворчасці. Вельмі складана не разгубіцца ў плыні інфармацыі. Сярод іншых, уплыў на фарміраванне светапогляду аказвае літаратура.

Пісьменнікі адказваюць за захаванне і распаўсюджванне асноўных прынцыпаў гуманізму, якія патрабуюць дастойнага стаўлення грамадства да ўсіх людзей незалежна ад іх фізічнага, матэрыяльнага, сацыяльнага становішча і прызнання права кожнага чалавека быць самім сабой.

Паглядзець на сябе з іншага боку, параўнаць уласнае існаванне з тым, якім яно павінна (можа) быць, дазваляе фантастычная літаратура.

Цікавасць да фантастыкі сучасных падлеткау (да і дарослых!) невыпадкова. Мы жывем у свеце, дзе кожны дзень сутыкаюцца новыя і старыя культурныя тыпы існавання. Наогул, мультыкультурнасць і самаідэнтычнасць, хоць і праходзяць выпрабаванне ў свеце сучасных рэалій, але ж застаюцца галоўнымі прынцыпамі годнага чалавечага жыцця.

Беларуская фантастычная літаратура існуе і развіваецца ў сусветным накірунку, аднак не выключае самабытнасці. Прапануем звярнуцца да творчасці Алёны Беланожкі, ў апавяданнях якой ярка адлюстраваны асновы чалавечнасці, бачанне дабра і зла.

Алёна Міхайлаўна Беланожка – рэжысёр, паэтка, пісьменніца, драматург. А. Беланожка – лаўрэат прэміі ў намінацыі «Шанц» нацыянальнага конкурсу на стварэнне літаратурнага сцэнарыя поўнаметражнай мастацкай стужкі на тэму «Моладзь. Сям’я. Грамадства» («Беларусьфільм», Мінск, 2008); пераможца адкрытага маладзёжнага конкурсу на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мультыплікацыйнага фільма, прысвечанага нацыянальнай тэматыцы (Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і «Беларусьфільм», Мінск, 2011), фіналістка конкурсу «Экслібрыс» (СПБ, Мінск, 2012), пераможца літаратурнага конкурсу Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі «Мост дружбы» (Масква-Мінск, 2012).

Прыкладам сцвярджэння гуманістычных прынцыпаў у творах А. Беланожкі можа служыць апавяданне «Грэбень у скрыні», якое было прызнана ў 2012 годзе пераможцам у літаратурным конкурсе Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі «Мост дружбы».

Галоўныя героі твора – студэнты-даследчыкі паранармальных з’яў, якія палююць на русалку і праводзяць над ёй бязлітасныя вопыты ў лабараторыі. Русалка вырываецца, і даследчыкі становяцца ахвярамі яе помсты. Толькі магутная сіла кахання і веры спыняе шэраг забойстваў і ператварае русалку ў чалавека.

Русалка – збіральны вобраз, які адлюстроўвае тых, каму патрэбна дапамога, пакінутых, адзінокіх у свеце, пакрыўджаных, азлобленых. І дзякуючы таму, што яе гісторыя – прыклад таго, што калі людзі будуць цікавіцца лёсамі тых, хто побач, не змогуць заставацца абыякавымі да іх праблем, заўсёды прыйдуць на дапамогу, якой не чакаюць, змогуць ахвяраваць сваім шчасцем, то грамадства выйдзе на новы ўзровень развіцця, яшчэ на некалькі крокаў наблізіўшыся да ідэальнага.

Апавяданне «Грэбень у скрыні» падштурхоўвае чытача да думкі, што толькі любоў, вера і спачуванне могуць спыніць агрэсію і дапамагчы чалавецтву ў стварэнні грамадства з высокімі маральнымі нормамі.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сказаць, што выхаванне гуманнасці праз літаратурна-фантастычныя творы дазваляе паспяхова развіваць такія асабістыя якасці, як міласэрнасць, дабрыня, справядлівасць, сумленнасць, чуласць, сардэчнасць, спагадлівасць. Фантастыка паказвае выраянты магчымага існавання, таму вабіць і падыходзіць пошукавай, адкрытай прыродзе чалавека, як пісьменніка, мастака, так і чытача. Тым самым, фантастыка дае філасофскую аснову для адказнага самавызначэння ўласнага жыцця і арыенціры для стваральнай дзейнасці у грамадстве.